CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA

Arkusz zawiera informacje prawnie chronione do momentu rozpoczęcia egzaminu.

**MOB 2016**

| UZUPEŁNIA ZDAJĄCY | |
|---|---|
| KOD | PESEL |

*miejsce na naklejkę*

☐ dysleksja

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM ROZSZERZONY

DATA: **24 maja 2016 r.**

GODZINA ROZPOCZĘCIA: **14:00**

CZAS PRACY: **180 minut**

LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **40**

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 9 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
3. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
4. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
5. Możesz korzystać ze słowników językowych.
6. Na tej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.

MOB-R1_1P-162

Układ graficzny
© CKE 2015

MOB 2016

**Wybierz jeden temat i napisz wypracowanie.**

**Тэма 1. На аснове дадзенага фрагмента тэксту прадстаў праблему і паразважай над ёй. Карыстайся тэзісам і думкамі аўтара і звярніся да іншага тэксту культуры. Твая праца павінна налічваць не менш чым 300 слоў.**

Юрка Буйнюк

*Людзі, чытайце кнігі!*
(скарочана)

Што рабіць, калі за акном шэрае, халоднае ды дажджлівае надвор'е? Што рабіць калі чакаем у даўжэзнай чарзе да лекара? Або калі мы захварэлі на прастуду ці падвярнулі нагу, якую маем у гіпсе, ды ў нас шмат свабоднага часу? Што рабіць са свабодным часам, калі ў тэлебачанні няма нічога цікавага паглядзець? Толькі не ўключайце камп'ютар! Гэтую цацку прыдумаў нейкі хітрун, каб адцягнуць мільярды маладых людзей ад кніг, каб маладыя не мелі свайго хобі ды зацікаўлення, каб пралівалі свае думкі, злосць, зайздрасць, нянавісць у інтэрнэце, а нехта нашыя думкі збірае, калекцыянуе і за нейкі час выкарыстае для сваіх нахабных мэт. Увогуле ўсякая электроніка створаная дзеля таго, каб маладым людзям забіраць час на самастойныя роздумы, мары, размовы. Сучаснае пакаленне маладых зусім не ўмее самастойна думаць, нішто іх не цікавіць. Гэта відаць на аўтарскіх сустрэчах, калі моладзь зусім не пытае аўтараў пра іх творчае жыццё. Аднак вернемся да мэты нашай размовы. Калі не тэлебачанне, калі не камп'ютар, інтэрнэт, то як цікава правесці час? Застаецца адно – пачытаць добрую кнігу. Бо ж найважнейшае, каб кніга нас зацікавіла.

Заўжды яна зразумее, заўжды спагадае, і час хутка зляціць, а не адзін сюжэт або цікавая фраза застануцца ў нашай памяці. Памятайце – няма большага шчасця, як узяць у рукі кнігу ды адплыць у чароўнае падарожжа, у якое запрашае нас аўтар. Няважнае, ці гэта будзе паэзія, ці проза, ці гэта будуць вершы, паэма, апавяданні ці раман; ці гэта будзе кніга некім прапанаваная, ці купленая ў антыкварыяце, ці пазычаная ў бібліятэцы. Памятайце, што дзень без кнігі – гэта страчаны дзень у нашым жыцці. Добрых кніг ёсць вельмі многа, паколькі многа на свеце дзяржаў, народаў, а ў іх – тысячы цікавых паэтаў, пісьменнікаў. А кожны пісьменнік адлюстроўвае даўно забыты свет. У кожным героі кнігі можам знайсці часціну свайго характару. А добрых пісьменнікаў у нас пад дастаткам. Няважнае, які жанр літаратуры чытаем, якой нацыянальнасці сам пісьменнік ды пра што апавядае кніга. Добрая кніга хавае ў сабе загадку, якая трымае нас у напружанні да апошняй хвіліны. Добрая кніга мае звышчасовую мараль. Аўтараў добрых ды цікавых кніг не трэба далёка шукаць, бо мы, беларусы, маем сваіх добрых аўтараў, такіх як Кузьма Чорны, Уладзімір Караткевіч, Васіль Быкаў, Іван Мележ, Максім Гарэцкі, Якуб Колас ці нават наш беластоцкі Міхась Андрасюк і многа многа іншых майстроў слова. […]

Кніга – гэта непаўторнае шчасце, якога нам не перадасць ні тэлебачанне, ні добры фільм, ні музыка, ні інтэрнэт. Гляджу на маладое пакаленне, якое траціць свой цэнны час на камп'ютарных гульнях, сядзіць закрытае ў чатырох сценах ды нідзе не выходзіць. Яны ніколі не будуць шчаслівыя, стануць нявольнікамі сучасных тэхналогій. Але я ніколі не кажу, што інтэрнэт – гэта найбольшае зло. Усё створанае для людзей, але каб мы карысталіся з мерай. Менавіта інтэрнэт можна выкарыстаць як цудоўную крыніцу для шукання цікавых аўтараў ды непаўторных кніг. […]

І я заахвочваю ўсіх чытаць і адкрываць чароўны свет кніг. Не марнуйце часу на тэлебачанне, на камп'ютарныя гульні, сацыяльныя сайты ці інтэрнэт. […] Лепш

пачытайце кнігу, так як гэта робіць многа людзей едучы на працу гарадскім транспартам. Таксама ў доўгае падарожжа цягніком ці аўтобусам забірайце не каляровую газетку, а манавіта кнігу, з якой карысна ды прыемна і хутка міне час падарожжа. Бо што ж у дарослым жыцці будзеце ўспамінаць як не першае сваё захапленне кнігай, якая найбольш блізкая вашаму сэрцу.

Ю. Буйнюк, *Людзі, чытайце кнігі!*, „Ніва”, № 28, 13 ліпеня 2014, с. 8.

**Тэма 2. Зрабі параўнаўчы аналіз і інтэрпрэтацыю вершаў. Твая праца павінна налічваць не менш чым 300 слоў.**

Дзмітры Шатыловіч

***Праявы***

Калі заплюшчу вочы ў цішыні,
І, змучаны, хачу набраць зноў сілы:
Уюцца думкі, быццам карані,
Пра родны край мой і яго магілы.

О, Беларусь, няшчасная мая,
Пакрытыя магільнікам, як лесам,
Пабітая снарадамі ў баях,
Засыпаная попелам АЭСа.

Звініць ад болю бедная Хатынь,
І выюць духі ветрам Курапатаў,
Яны такой жа ганьбай, як Катынь,
Абвінавачваюць вядомых супастатаў[1].

Напамінаюць іх таксама ў нас
Па-варварску папаленыя вёскі –
Залешаны, Шпакі, Чыжы і Райск –
І ўсе злачынствы ў Вульцы Выганоўскай.

Я на хвіліну ўбачу, як у сне,
Кагорты войск з крыжамі і арламі,
Пажары, кроў і бітвы па вайне
Над нашымі лугамі і палямі.

Зямля стагнала ад чужых палкоў,
Яны нам забіралі душу, мову,
Няволю нам дарылі ад вякоў,
Надзею замянілі пустаслоўем.

[1] Супастат – вораг, непрыяцель.

І вось, калі заззяў свабоды бляск,
Калі знялі нам з плеч цяжар няволі –
Надзеі асталося мала ў нас
Што будзе шчаслівейшай доля.
Калі ж адкрыю вочы і зірну
І ўбачу я свой край у бляску сонца,
Надзею я пачую як вясну,
Якой хацеў бы цешыцца бясконца.

Дз. Шатыловіч, *Праявы* [у:] Ён жа, *Хвалі часу*, Беласток 2000, с. 12–13.

Віктар Швед

***Райск***

*Памяці 149 жыхароў Райска,*
*расстраляных гітлераўцамі*
*16.VI.1942 г.*
*за супрацоўніцтва з партызанамі.*

Райск – нічога супольнага з раем,
Быў найгоршага пекла здзяйсненнем.
Тут фашыстаў навала ліхая
Смерць пасеяла поўнаю жменяй.

Колькі ж сэрцаў тут спынены стукат!
Вёска згладжана, пушчана з дымам.
Нат' каменні тут вырваны з бруку
Праз нянавісць да нашай радзімы.

Жыцця вораг найгоршы не знішчыць,
Жыцця смерцю ніхто не падменіць.
Адрадзілася зноў з папялішчаў
Вёска Райск як услаўлены фенікс.

Прамінулі няшчасці, пакуты,
Гаспадарыць загінуўшых дзеці.
Ды нянавісць да ворагаў лютых
Панясуць пакаленні ў сталецці.

В. Швед, *Райск* [у:] Ён жа, *Жыццёвыя сцежкі*, Беласток 1967, с. 38.

# WYPRACOWANIE

**na temat nr....................**

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

**Tabelę wypełnia egzaminator!**

| | | Liczba punktów | Suma | Uzasadnienie przyznania 0 punktów |
|---|---|---|---|---|
| wypowiedź argumentacyjna | A. | 0 – 3 – 6 – 9 | | |
| | B. | 0 – 3 – 6 – 9 | | |
| interpretacja porównawcza | A. | 0 – 2 – 4 – 6 | | |
| | B. | 0 – 4 – 8 – 12 | | |
| | C. | 0 – 2 | | |
| | D. | 0 – 3 – 6 | | |
| | E. | 0 – 1 – 2 | | |
| | F. | 0 – 2 – 4 | | |
| | G. | 0 – 2 – 4 | | |
| | H. | 0 – 2 – 4 | | |

## BRUDNOPIS *(nie podlega ocenie)*